САНІТАРНЫЯ ВЕДЫ —
У МАСЫ

Дацэнт П. В. ДЫЛА

ВЕНЕРЫЧНАЯ ХВАРОБА ГАНАРЭЯ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1956

МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БССР

БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ
СКУРНА-ВЕНЕРАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ

Дацэнт П. В. ДЫЛА

ВЕНЕРЫЧНАЯ ХВАРОБА ГАНАРЭЯ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя навукова-тэхнічнай літаратуры
МІНСК 1956

Надрукавана
Дзяржаўным выдавецтвам БССР
па заказу
Міністэрства аховы здароўя БССР

ШТО ТАКОЕ ГАНАРЭЯ

Ганарэя — гэта заразная венерычная хвароба, узнікаючая пры пападанні на абалонкі палавых органаў або вачэй мікробаў, якія называюцца гонакокамі.

Велічыня гонакокаў настолькі малая, што на 1 сантыметры ўмяшчаецца 1 мільён гэтых мікробаў.

Ганарэя — захворванне ўсяго арганізма, але першыя прыкметы хваробы паяўляюцца на палавых органах, з якіх пры гэтым выдзяляецца гной, а абалонкі іх прыпухаюць і робяцца чырвонымі.

Каб знайсці мікробаў у гнойных выдзяленнях з палавых органаў або з вачэй, карыстаюцца мікраскопам.

ШЛЯХІ ЗАРАЖЭННЯ ГАНАРЭЯЙ

Заражаюцца гэтай хваробай у час палавых зносін з хворымі ганарэяй. Заражэнне ганарэяй магчыма таксама і непалавым шляхам, калі мікробы, выклікаючыя гэтую хваробу, перадаюцца здаровым людзям праз мачалку, ручнік, начны гаршчок, стульчак у прыбіральні і інцыя прадметы хатняга ўжытку, якімі карысталіся

хворыя ганарэяй і пасля якіх гэтыя прадметы не былі старанна вымыты і прадэзінфіцыраваны, гэта значыць абеззаражаны. Заражэнне магчыма таксама і тады, калі ў адной пасцелі спяць хворыя ганарэяй і здаровыя.

Мікробы ганарэі лёгка заносяцца ў вочы рукамі пасля дакранання да хворага палавога органа або забруджанай гноем бялізны.

Нованароджаныя заражаюцца ганарэяй вачэй і палавых органаў у час родаў пры праходжанні праз палавыя органы маці, хворай ганарэяй.

Каб пазбегнуць заражэння нованароджаных, цяжарныя і парадзіхі, хворыя ганарэяй, абавязаны паведаміць аб гэтай хваробе ў жаночай кансультацыі і радзільным доме ўрачу або акушэрцы, якія абавязаны прыняць меры для засцеражэння дзіцяці ад заражэння ганарэяй.

Каб засцерагчы дзяцей ад захворвання ганарэяй вачэй, усім нованароджаным зараз-жа пасля нараджэння ўпускаюць у вочы некалькі кропель 2-працэнтнага раствору ляпісу або раствору пеніцыліну.

ХОД ХВАРОБЫ

Захворванне ганарэяй выяўляецца праз 2—5 сутак або некалькі пазней пасля палавых зносін з хворым чалавекам.

Хвароба пачынаецца з запалення абалонкі мочаспускальнага канала, якая пры гэтым робіцца чырвонай, прыпухае, паяўляецца боль і рэзь у канале пры мочаспусканні; з канала выдзяляецца гной, які выклікае сверб і пякоту вонкавых палавых органаў. Сцякаючы на бялізну, гной пакідае зеленавата-жоўтыя плямы.

У вострым перыядзе ганарэі мача бывае мутнай, гноеаддзяленне вялікае. Аднак часта ў жанчын, а часам і ў мужчын хвароба развіваецца непрыкметна. У гэтых выпадках выдзяленні з палавых органаў бываюць невялікія, ледзь прыкметныя, часцей слізіста-гнойныя або рэдкія і мутныя. У гэтых хворых часта заўважаецца сверб, пякота і шчыкатанне ў палавых органах.

Мікробы — гонакокі, знаходзячыся на слізістай абалонцы мочапалавых органаў, пранікаюць у складкі, паглыбленні і залозы і выклікаюць у іх запаленне.

У жанчын мікробы могуць пранікаць у мочаспускальны канал, у шыйку і цела маткі, матачныя трубы і яечнікі, а таксама ў слізістую абалонку задняга праходу, выклікаючы ганарэйнае запаленне гэтых органаў.

Пры паяўленні адзначаных ускладненняў хваробы парушаецца агульнае самаадчуванне хворых, часта павышаецца тэмпература. Хворыя жанчыны скардзяцца на боль у нізе жывата, у паясніцы і на расстройства менструацыі — кроў пры гэтым ідзе ў вялікай колькасці 6 — 7 дзён і больш.

Запаленне матачных труб у жанчын вядзе да звужэння іх прасвету або да поўнага зарашчэння іх. Пры звужэнні прасвету матачнай трубы ў ёй можа затрымацца аплодненае яйцо, у выніку чаго развіваецца трубная, або пазаматачная, цяжарнасць, якая канчаецца разрывам трубы, кровацячэннем у брушную поласць і нават смерцю жанчыны, калі своечасова не зрабіць аперацыі.

Пры поўным зарашчэнні матачных труб, змя-

неннях у матцы і яечніках у жанчыны развіваецца бясплоддзе.

Менструацыі, роды і аборты пагаршаюць цячэнне ганарэі і часта прыводзяць да цяжкіх запаленчых працэсаў у прыдатках маткі, запалення брушыны і інш.

Пры хранічнай ганарэі ўрачы рэкамендуюць жанчыне з'яўляцца для абследавання ў час менструацыі або зараз-жа пасля яе, таму што ў гэты час лягчэй выявіць мікробы ў выдзяленнях з палавых органаў і, такім чынам, распазнаць хваробу.

Пры запушчанай, доўга не лечанай ганарэі ў мужчын гонакокі могуць пранікаць у прыдатак яечка, якое прыпухае да велічыні курынага яйка і больш і робіцца балючым. Гонакокі, пранікаючы ў семявыносячы праток, выклікаюць балючае патаўшчэнне яго сценак; боль перадаецца ў машонку, пах, ніз жывата, паясніцу.

Пры запаленні прыдаткаў абодвух яечак і семявыносячых пратокаў мужчына траціць здольнасць апладняць жанчыну, таму што семявыносячыя пратокі зарастаюць і семянным цельцам закрыт выхад з яечак.

Запаленне семянных пузыркоў і прастатычнай залозы ў мужчын выклікае боль у нізе жывата, у заднім праходзе, у паясніцы і інш.

Хранічнае запаленне абалонкі мочаспускальнага канала суправаджаецца нязначнымі слізіста-гнойнымі выдзяленнямі з канала і непрыемным шчыкатаннем або паколваннем у ім і ў галоўцы палавога члена.

Гонакокі, пранікаючы ў кроў, паражаюць увесь арганізм: нервы, суставы, мышцы, сэрца і інш. Таму ганарэя з'яўляецца вельмі сур'ёз-

ным і нават небяспечным захворваннем не толькі мочапалавых органаў, але і ўсяго арганізма.

Калі хворы вострай формай ганарэі не лечыцца, захворванне пераходзіць у хранічную ганарэю, якая цягнецца шмат месяцаў і цяжка вылечваецца.

ЛЯЧЭННЕ ХВОРЫХ ГАНАРЭЯЙ

Медыцына мае зусім надзейныя спосабы лячэння хворых ганарэяй.

Лячэнне павінна праводзіцца пад наглядам урача. Самалячэнне хворых звычайна прыводзіць да цяжкіх вынікаў, таму што хвароба набывае хранічную форму, паяўляюцца ўскладненні ганарэі — запаленне маткі, труб і яечнікаў у жанчын, у мужчын-жа паражаюцца прыдатак яечка, семянныя пузыркі, семявыносячыя пратокі, прастата і іншыя органы.

Толькі ўрач можа назначыць правільнае лячэнне хворым ганарэяй. Чым раней звернуцца за медычнай дапамогай, тым лягчэй вылечваецца хвароба.

Лячэнне бывае паспяховым, калі яно даводзіцца да канца. Нельга спыняць лячэнне без заключэння ўрача аб выздараўленні. Пасля заканчэння лячэння хвораму неабходна з'яўляцца да лечачага ўрача на працягу 2—3 месяцаў для праверкі вылячэння ад ганарэі.

ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН ХВОРЫХ ГАНАРЭЯЙ

Поспех лячэння шмат у чым залежыць ад паводзін хворых у час лячэння. Хворым ганарэяй шкодна ўжываць вострую ежу — цыбулю, хрэн, салёныя гуркі, селядцы, гарчыцу, кіслую

капусту, перац, воцат і да т. п. Не трэба піць спіртныя і газіраваныя напіткі, піва, а таксама моцны чай і кофе. Хворым ганарэяй забараняецца мець палавыя зносіны, таму што гэта пагаршае ход хваробы і прыводзіць да заражэння другіх асоб.

Працяглая хадзьба, скачкі, танцы, язда на веласіпедзе, матацыкле, аўтамабілі шкодны, асабліва пры вострай ганарэі.

Хворыя ганарэяй павінны спаць у асобным ложку, а таксама карыстацца асобнай мачалкай, ручніком, тазам.

Пасля кожнага дакранання да хворых палавых органаў трэба мыць рукі, каб не занесці мікробаў ганарэі ў вочы.

Хворыя ганарэяй павінны паведаміць лечачаму ўрачу адрас, прозвішча і імя той асобы, ад якой яны заразіліся, а таксама тых, з якімі хворыя ганарэяй мелі палавыя зносіны да лячэння або ў час лячэння. Маці, хворыя ганарэяй, павінны прыводзіць да ўрача дзяцей для абследавання іх на магчымае захворванне ганарэяй.

Хворым трэба памятаць, што свядомае заражэнне другой асобы венерычнай хваробай караецца пазбаўленнем волі да 3 год, згодна з артыкулам 150 Крымінальнага кодэкса.

ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫ СЯБЕ АД ЗАХВОРВАННЯ ГАНАРЭЯЙ

Пры кожных выпадковых палавых зносінах ёсць небяспека заражэння венерычнымі хваробамі — ганарэяй, сіфілісам або мяккім шанкрам.

Пасля выпадковай палавой сувязі неабходна

не пазней чым праз 2—4 гадзіны звярнуцца на пункт супроцьвенерычнай дапамогі, дзе на працягу круглых сутак аказваецца медычная дапамога. Калі гэтага нельга зрабіць, то пасля палавых зносін трэба памачыцца, абмыць вадой з мылам палавыя органы і праспрынцаваць іх слабым растворам марганцавакіслага калія.

АРГАНІЗАЦЫЯ БАРАЦЬБЫ З ВЕНЕРЫЧНЫМІ ХВАРОБАМІ

У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для паспяховай барацьбы з венерычнымі хваробамі. Разгорнута шырокая сетка медыцынскіх устаноў, дзе хворым забяспечана бясплатная медычная дапамога. Урачы лечаць хворых, праводзяць растлумачальную работу па засцеражэнню ад венерычных хвароб, абследуюць членаў сям'і хворых і цяжарных жанчын.

Усе гэтыя мерапрыемствы даюць добрыя вынікі. Колькасць хворых ганарэяй і іншымі венерычнымі хваробамі з кожным годам у нас робіцца ўсё меншай і меншай, а ў бліжэйшы час у СССР будуць канчаткова ліквідаваны заразныя формы венерычных хвароб.

Побач з гэтым у капіталістычных краінах ёсць шмат хворых венерычнымі хваробамі і няма прадпасылак для змяншэння іх колькасці, бо платнае лячэнне ў гэтых выпадках не ўсім даступна. Таму многія хворыя не лечацца і міжвольна распаўсюджваюць заразу.

Распаўсюджванню венерычных хвароб у капіталістычных краінах таксама спрыяе беспрацоўе, якое штурхае беспрацоўных жанчын на прастытуцыю, а дзе прастытуцыя, там і венерычныя хваробы.

ПАРАДЫ ЧЫТАЧАМ

1. Трэба пазбягаць выпадковых палавых зносін, бо ў іх тоіцца небяспека заражэння венерычнымі хваробамі, якія пасля гэтага могуць перадацца і другім асобам.

2. Пры выпадковых палавых зносінах мужчыны павінны карыстацца прэзерватывам, што ў некаторай ступені засцерагае і мужчыну і жанчыну ад заражэння венерычнымі хваробамі.

3. Захварэўшыя венерычнай хваробай павінны як мага хутчэй звярнуцца за медычнай дапамогай.

4. Самалячэнне хворых прыводзіць да цяжкіх вынікаў, таму што хвароба пераходзіць у хранічную форму з рознымі ўскладненнямі і цяжка вылечваецца.

5. Каб лячэнне, назначанае ўрачом, было карысным і прывяло да хуткага вылячэння, хворыя абавязаны дакладна выконваць усе ўказанні ўрача.

6. Лячыцца трэба да таго часу, пакуль лечачы ўрач не дасць заключэння аб вылячэнні хваробы. Спыненне хворым лячэння без дазволу ўрача прыносіць вялікую шкоду.

7. Як дзеці, так і дарослыя не павінны карыстацца мачалкамі, ручнікамі, начнымі гаршкамі і прадметамі хатняга ўжытку, якімі карыстаюцца другія асобы, а тым больш хворыя ганарэяй.

8. Неахайна і шкодна спаць у адной пасцелі дарослым і не рэкамендуецца браць дзяцей у пасцель да старшых.

ЗМЕСТ

	Стар.
Што такое ганарэя	3
Шляхі заражэння ганарэяй	—
Ход хваробы	4
Лячэнне хворых ганарэяй	7
Правілы паводзін хворых ганарэяй	—
Як засцерагчы сябе ад захворвання ганарэяй .	8
Арганізацыя барацьбы з венерычнымі хваробамі	9
Парады чытачам	10

На белорусском языке
П. В. Дыло
Венерическая болезнь гоноррея
Государственное издательство БССР
Минск 1956

*

Рэдактар *А. Пракапчук*
Тэхрэдактар *А. Труханава*
Карэктар *А. Каралёва*

*

АТ 00994. Падп. да друку 23|III 1956 г.
Тыраж 10 000 экз. Фармат 70×92|32. Фіз. друк.
арк. 0,375. Ум. друк. арк. 6,439. Уч.-выд. арк. 0,3.
Бесплатно. Зак. 168.

Друкарня імя Сталіна, Мінск,
праспект імя Сталіна, 105.

[329]